# СОЗДАНИЕ И РЕКОНСТРУКЦИЯ ПРОИЗВЕДЕНИЙ МОНУМЕНТАЛЬНОГО ИСКУССТВА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

## Основной документ

## Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 19.09.2008 № 1372

## «Аб некаторых пытаннях стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва»

Падрыхтаваны змяненні и дапаўненні ў пастанову

**Мемарыяльны ансамбль** - манументальная скульптура ў выглядзе архітэктурна-пластычнай мнагапланавай кампазіцыі, прысвечаная важнай гістарычнай падзеі, якая мае важнае ландшафтнае значэнне, можа мецць плошчу 1 кв.км і больш.

**Помнік** - адна- ці шматкампанентная манументальная скульптура, якая прысвечана важнай гістарычнай падзеі ці вядомай асобе, знакамітаму дзеячу і (ці) іншым жывым істотам, уключае, як правіла, у сябе партрэтную выяву (выявы), мае важнае значэнне ў арганізацыі навакольнай прасторы (гарадской, паркавай), прыроднага ландшафта і, як правіла, вышыню 2 м і болей.





**Помнік-бюст** - аднафігурная манументальная скульптура, якая ствараецца для ўвекавечвання пэўнага знакамітага дзеяча ці вядомай асобы, фігура якой выяўляецца не цалкам, а мае паплечны, пагрудны або паясны абрэз і размяшчаецца на пастаменце, мае важнае значэнне ў арганізацыі навакольнай прасторы (гарадской, паркавай), прыроднага ландшафту і, як правша, вышыню (з пастаментам) 2 м і болей.

**Надмагільны помнік** - аднакампанентная манументальная скульптура, якая размяшчаецца непасрэдна каля або на месцы пахавання вядомай асобы ці знакамітага дзеяча, ствараецца ў межах установленых лінейных параметраў для тэрыторыі пахавання і, як правіла, мае вышыню ад 2 да 5 м.








**Памятны знак** - аднакампанентная манументальная скульптура, якая абазначае месца, дзе адбылася важная гістарычная падзея, утрымлівае мемарыяльную інфармацыю і не займае дамінуючага месца ў навакольнай прасторы, мае трохмернае, плоскае або рэльефнае пластычнае рашэнне і, як правіла, вышыню ад 0,5 да 1,5 м.

**Памятная (мемарыяльная) дошка** - манументальная скульптура, прысвечаная важным гістарычным ці іншым падзеям, знамянальным датам або вядомым асобам, знакамітым дзеячам у выглядзе дошкі, якая устанаўліваецца вертыкальна на фасадзе або ў інтэр'ерах будынка, на тэрыторыях і пабудовах, звязаных з дадзенымі падзеямі, жыццём і дзейнасцю вядомых асоб ці знакамітых дзеячаў, утрымлівае кароткія біяграфічныя звесткі аб вядомай асобе ці знакамітым дзеячы, або інфармацыю пра падзею, якой яна прысвечана, як правіла, мае плошчу не болей 2 кв.м і ўсталёўваецца на вышыні каля 2 м ад зямлі.







**Мемарыяльная пліта** - манументальная скульптура, прысвечаная важным гістарычным ці іншым падзеям, можа ўключаць рэльеф або жывапісную выяву, як правіла, мае плошчу ад 1 да 10 кв.м і гарызантальнае размяшчэнне.

**Абяліск** - манументальная скульптура ў выглядзе гранёнага каменнага слупа, які звужаецца уверсе, мае завостраную трапіцальную верхавіну.

**Стэла** - манументальная скульптура, прысвечаная важным гістарычным ці іншым падзеям, знамянальным датам у выглядзе пліты (або слупа) з высечанымі на ёй тэкстам або выявамі, устанаулівaецца звычайна ў якасці пахавальнага і памятнага знака рознай вышыні.

**Манументальна-дэкаратыуная скульптура** - творы, што маюць самастойнае значэнне ці выконваюць ролю архітэктурных элементаў, якія прызначаны, як правіла, для аздаблення збудаванняў, маюць дэкаратыуны характар, канкрэтызуюць архітэктурны вобраз будынка ці архітэктурнага ансамбля.

**Акрамя таго Пастанова рэгулюе стварэнне**:

**Манументальнага жывапісу** (у тым ліку **графіці**),

**Дэкаратыўна-аздабленчых формаў**,

**Мастацкіх тканін**, прызначаных для аздаблення архітэктурных ансамбляў і інтэр’ера

**Стварэнне** (рэканструкцыя) і ўстаноўка твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ажыццяўляецца па заказу **дзяржаўных органаў, дзяржаўных арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый і фізічных асоб.**

**АБАВЯЗКОВА ПАВІННА БЫЦЬ**
**ЗАКЛЮЧЭННЕ МІНКУЛЬТА**
**пры стварэнні:**

**твораў манументальнага мастацтва** (незалежна ад сродкаў фінансавання),
**манументальна-дэкаратыўнай скульптуры** (за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў).

У Мінкульт накіроўваецца **пісьма-зварот** да якога прыкладаецца **Даведка-абгрунатванне** з біяграфічнымі дадзенымі пра асобу, інфармацыяй пра падзею, матывацыя ўсталявання твора, <u>прыкадны памер і крыніцы фінансавання</u> (спонсарскія сродкі, бюджэт і г.д.).

<u>Новы праект пастановы патрабуе накіроўваць ў Мінкульт і заключэнне НАН Беларусі</u>

**П. 5.** Палажэнне не распаўсюджваецца на надмагільныя помнікі, якія ўстанаўліваюцца па заказу фізічных асоб за ўласны кошт (акрамя тых, што ўсталёўваюцца на тэрыторыі мемарыяльных комплексаў, ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцей).



п. 6 Стварэнне (рэканструкцыя) твораў **манументальнай скульптуры** і ўстаноўка іх на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца па **рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў** на **падставе заключэння Міністэрства культуры.**

**<u>У праекце Пастановы</u>**

Стварэнне мемарыяльных ансамбляў, манументаў-помнікаў, помнікаў, помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў па рашэнні **АБЛВЫКАНКАМАЎ.**

Памятных знакаў, памятных дошак, мемарыяльных пліт, абеліскаў, стэл па рашэнні **гарадскіх і райвыканкамаў, па ўзгадненні з аблвыканкамамі**

Манументальна-дэкаратыўных твораў па рашэнні мясцовых распарадчых і выканаўчых органаў.

З **Прэзідэнтам трэба <u>ўзгадняць</u> стварэнне** мемарыяльных ансамбляў, манументаў-помнікаў, помнікаў, якія ствараюцца ў Рэспубліцы,
а таксама помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў, якія ствараюцца ў абласных цэнтрах і г. Мінску
<u>(у праекце пастановы ўсе з пералічаных, незалежна ад месца ўстаноўкі).</u>

З **аблвыканкамам** - помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў, якія ствараюцца на тэрыторыях абласцей, за выключэннем абласных цэнтраў.

<u>У праекце Пастановы прадугледжана ўзгадненне памятных знакаў, памятных дошак, мемарыяльных пліт, абеліскаў стэл</u>

Для **ўзгаднення** рашэння аб стварэнні (рэканструкцыі) і ўстаноўцы твораў манументальнай скульптуры мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі прадстаўляюцца :

**пісьмо-зварот аб узгадненні рашэння;**

**даведка-абгрунтаванне неабходнасці стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі твораў манументальнай скульптуры,** у тым ліку з вызначэннем крыніц і памераў фінансавання;

**заключэнне Міністэрства культуры;**

**іншыя інфармацыйныя матэрыялы.**

У праекце прадугледжана і **копія карты населенага пункта** з пазначаным месцам устаноўкі аб'екта

Для стварэння (рэканструкцыі) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва распрацоўваецца іх **эскізны праект**.

У выпадках, звязаных са стварэннем найбольш значных і складаных па тэматыцы і кампазіцыі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, заказчык праводзіць **конкурс** эскізных праектаў.

Этапы стварэння твораў:

выкананне **эскізнага праекта**;

выкананне **рабочай мадэлі** (рабочага эскізу);

выкананне **мадэлі у натуральную велічыню**;

выраб **твора** ў **матэрыяле**.

Адбор эскізных праектаў твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва праводзіцца заказчыкам на падставе экспертнага заключэння абласных і Мінскага гарадскога **мастацка-экспертных саветаў.**

**Тыя творы, якія неабходна ўзгадняць з Прэзідэнтам, разглядае рэспубліканскі мастацка-экспертны савет**





Поўны пералік таго, што павінен уключаць эскізны праект твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва вызначаны ў п. 14 Палажэння.

У абавязковым парадку ў абласны савет павінны быць накіравны наступныя матэрыялы:

**сітуацыйны план** (выкапіроўка з генеральнага плана) у маштабе 1:500 размяшчэння аб’екта, зацверджаны галоўным архітэктарам;

**эскіз кампазіцыйнага рашэння** (для скульптуры - у мяккім матэрыяле) у маштабе не менш за 1:10;

**агульная тлумачальная запіска** з кароткім апісаннем рашэнняў з прывядзеннем асноўных разліковых даных па канструкцыях і інжынернаму абсталяванню (пры неабходнасці) і разлікам прыкладнага кошту.

п.26 Палажэння **«Канчатковыя разлікі па дагаворах з аўтарамі і выканаўцамі ажыццяўляюцца пасля падпісання акта дзяржаўнай прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва»**

п. 27 «Пасля стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі на месцы твора манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва **заказчык** прызначае **рабочую камісію** для вызначэння яго гатоўнасці, у склад якой уваходзяць *прадстаўнікі заказчыка, выканаўцы, аўтары ці калектыў аўтараў*. Рабочая камісія складае **акт аб гатоўнасці твора да дзяржаўнай прыёмкі**».

п.28. Дзяржаўная прыёмка твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ажыццяўляецца **дзяржаўнымі камісіямі** (Склад абласной камісіі зацверджаны **22 снежня 2015 г.** рашэнне №823)

Для правядзення дзяржаўнай прыёмкі манументальных твораў у абласную камісію накіроўваюцца (на адрас галоўнага ўпраўлення):

**каштарыс і рабочыя чарцяжы**;

**акт на земляныя работ**ы (пры неабходнасці);

**акт устаноўкі твора**;

**акт добраўпарадкавання тэрыторыі** (пры неабходнасці);

**фатаграфіі** выкананага твора;

**акт рабочай камісіі аб гатоўнасці твора** да дзяржаўнай прыёмкі.

Аб'екты, якія ўстанаўліваюцца па ўзгадненні з Прэзідэнтам, прымаюцца рэспубліканскай камісіяй

**Дадзенае палажэнне не адносіцца да выпадкаў рэканструкцыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія ўзгадняюцца і зацвярджаюцца ў парадку, вызначаным заканадаўствам.**

П. 36 “За парушэнне дадзенага Палажэння, устаноўку твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва без належнага ўзгаднення вінаватыя нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам. Творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія ўстаноўлены самавольна або не прайшлі дзяржаўную прыёмку ва ўстаноўленым парадку, **падлягаюць дэмантажу**».

(новая рэдакцыя прадугледжвае адміністрацыйную адказнасць, прапісаную працэдуру дэмантажу, парадак спагнання выдаткаў)